# Інфармацыя, прымеркаваная да Дня прафілактыкі інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам




Дзяржаўная ўстанова “Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Савецкага раёна горада Мінска” інфармуе, што 21 лютага – Дзень прафілактыкі інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам.

Штодня ва ўсім свеце больш за мільён чалавек набываюць інфекцыю, якая перадаецца палавым шляхам. Найбольш часта – хламідыёз, ганарэю, пранцы або трыхаманіяз. Большасць дадзеных інфекцый працякаюць бессімптомна або з нязначнай сімптаматыкай, таму часта застаюцца нераспазнанымі на пачатковых этапах. І ў некаторых выпадках могуць мець сур’ёзныя наступствы для рэпрадуктыўнага здароўя. А менавіта –

бясплоддзе ці перадача інфекцыі ад маці да дзіцяці.

Пры сэксуальным кантакце перадаецца больш за 30 розных бактэрый, вірусаў і паразітаў. З найбольшым захворваннем звязаны восем інфекцый. Чатыры з іх вылечныя: пранцы, ганарэя, хламідыёз і трыхаманіяз. Іншыя чатыры інфекцыі ў цяперашні час цалкам не лечацца – гепатыт B, вірус простага герпесу, ВІЧ (вірус імунадэфіцыту чалавека) і вірус папіломы чалавека. Сімптомы ці ўздзеянне, якія не паддаюцца лячэнню вірусных інфекцый можна паменшыць ці змяніць з дапамогай тэрапіі.

Інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, таксама могуць распаўсюджвацца ад чалавека да чалавека пры пераліванні прадуктаў крыві і перасадцы тканін, ад маці дзіцяці падчас цяжарнасці і родаў.

Асноўнай прафілактычнай мерай з’яўляецца засцярога пры дапамозе прэзерватыва; у наш час прэзерватывы існуюць і мужчынскія, і жаночыя. Таксама да прафілактычных мерапрыемстваў адносяцца:

- правільнае прымяненне мясцовых бактэрыцыдных сродкаў;
- перыядычнае абследаванне з дапамогай лабараторнай дыягностыкі, экспрэс-тэстаў на ВІЧ і пранцы;
- у выпадку дыягнаставання інфекцыі – спецыялізаванае лячэнне;
- палавое ўстрыманне;
- апавяшчэнне палавых партнёраў;
- вакцынапрафілактыка супраць віруса гепатыту B і віруса паппіломы чалавека.

*(па матэрыялах СААЗ)

Важна ведаць і памятаць, што інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, не праходзяць “самі па сабе” без спецыялізаванага лячэння.

Будзьце здаровыя і дасведчаныя!